

Паважаныя студэнты. Прапануем вашай увазе электронны адрас "Архівы Беларусі" – http://archives.gov.by/index.php

http://archives.gov.by/index.php?id=11

Сайт "Архівы Беларусі" - інфармацыйны рэсурс органаў архіўнай справы і справаводства і сістэмы дзяржаўных архіўных устаноў Рэспублікі Беларусь.

На сайце змяшчаюцца звесткі аб дзяржаўных архіўных установах і аказваемых імі паслугах. Прадстаўлена інфармацыя па генеалогіі, археаграфіі, заканадаўству і прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў.

Агульным арыенцірам у шматлікіх дакументах Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь з'яўляецца комплекс дадзеных аб архіўных даведніках.

Значную частку складаюць матэрыялы, якія адлюстроўваюць гісторыю Беларусі, разнастайнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа. Гэта тэматычныя распрацоўкі, якія змяшчаюць пералікі і віртуальную выставу дакументаў архіваў, прадстаўнічую інфармацыю аб архіўных выданнях, а таксама аглядную даведачную інфармацыю па асвятляемых пытаннях. Сярод іх:

- **падзеі Вялікай Айчыннай вайны** (агляд падзей вайны; архіўныя дакументы і матэрыялы пра вайну; архіўныя выданні пра вайну; партызанскія зоны на тэрыторыі Беларусі ў гады вайны; удзельнікі партызанскага руху ў Беларусі - кіраўнікі БССР і СССР у 50-70-я гг. XX ст.; беларускія вёскі, спаленыя ў гады вайны (электронная база дадзеных);
- **Першая сусветная вайна;**
- **вайна 1812 года;**
- **паўстанне 1863-1864 гадоў на тэрыторыі Беларусі;**
- **культура Беларусі** (культавае дойлідства, архітэктура замкаў, палацава-сядзібных комплексаў і галоўнай магістралі Мінска - праспекта Незалежнасці, творчасць архітэктараў Іосіфа Лангбарда і Уладзіміра Караля);

- **жыццё і дзейнасць выбітных асоб** (Ігната Дамейкі, Напалеона Орды, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Браніслава Эпімах-Шипилло, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Барыса Кіта, Уладзіміра Караткевіча).

Адмысловым блокам інфармацыі з'яўляюцца матэрыялы праекта ЮНЕСКА "Культурная спадчына Рэчы Паспалітай», у якіх апісваюцца адпаведныя фонды і рукапісныя калекцыі архіваў і бібліятэк многіх еўрапейскіх краін (Беларусі, Польшчы, Украіны, Літвы, Расіі, Германіі, Аўстрыі, Францыі, Швецыі, Фінляндыі).